*Папко В.М. (БрДТУ, Брэст)*

# ТРАНСФАРМАЦЫЯ КУЛЬТУРНАЙ ПАЛІТЫКІ БССР ВА ЎМОВАХ ПЕРАБУДОВЫ (др. пал. 80х г.г. XX ст.)

У СССР існавала сістэма жорсткага нагляду за працэсамі, якія адбываліся ў мастацтве. У 20-30-я г.г. паступова было зведзена да нуля развіццё ўсіх мастацкіх плыняў, акрамя "сацыялістычнага рэалізму". Асабліва праследаваліся творцы, якія былі прыхільнікамі авангарду ва ўсіх яго праявах. Дзейнасць усіх устаноў мастацтва планавалася, як быццам бы гэта завод ці фабрыка. Галоўнымі ў гэтым планаванні былі колькасныя паказчыкі - колькасць новых пастановак, гледачоў, спектакляў, паказаных на стацыянарнай пляцоўцы альбо на сяле і г.д. Ведамасны падыход прынёс шмат шкоды. Да таго ж існавала жорсткае падпарадкаванне ніжэйшых устаноў вышэйшым - міністэрства культуры СССР адыгрывала галоўную ролю ў дачыненні "ніжэйшых" рэспубліканскіх міністэрстваў. У такіх умовах цяжка гаварыць аб правядзенні самастойнай нацыянальнай культурнай палітыкі.

Ажыццяўлялася пастаянная ідэалагічная апрацоўка творчых работнікаў, якая афіцыйна называлася «марксісцка-ленінскай адукацыяй». Цантральны камітэт камуністычнай партыі Беларусі, гарадскія камітэты КПБ і прафсаюзныя арганізацыі пільна сачылі за станам «марксісцка-ленінскай адукацыі» у тэатрах, музычных і харэаграфічных калектывах. Гэтая дзейнасць трактавалася як «ідэйна-выхаваўчая работа творчых работнікаў». У 1982-1983 навучальным годзе толькі ў Мінску ў творчых калектывах працавала 107 школ навуковага камунізма, тэарытычных і метадалагічных семінараў. Па афіцыйных звестках, заняткі наведвала 1424 чалавека, з якіх 418 чалавек - у школах навуковага камунізма, а 1006 творчых работнікаў - у семінарах. Напрыклад, у Белдзяржфілармоніі з сярэдзіны 70-х г.г.. дзейнічаў семінар «Ленін, КПСС аб літаратуры і мастацтве», які лічыўся адным з лепшых у сістэме партыйнага выхавання творчых работнікаў. Заняткі ў гэтых школах і семінарах праводзіліся так званымі прапагандыстамі, якія былі членамі калектыву. Прапагандысты адбіраліся вельмі ўважліва: са 107 прапагандыстаў творчых калектываў і арганізацый г. Мінска 91 былі членамі КПСС, 45 скончылі універсітэт марксізма-ленінізма пры Мінскім абкаме КПБ, 85 мелі прапагандысцкі стаж больш за тры гады. (Дадзеныя за 1983 г.)

Кіраўніцтва творчых калектываў і арганізацый - сакратары партыйных арганізацый, намеснікі старшынь і адказныя сакратары праўленняў творчых саюзаў, дырэктары, іх намеснікі, галоўныя рэжысёры (усяго больш за 200 асоб) павінны былі наведваць заняткі ў пастаянным семінары «Ленінская тэарэтычная спадчына і праблемы эстэтычнага выхавання працоўных у сучасных умовах». Семінар працаваў пры Мінскім абласным і гарадскім камітэтах партыі; заняткі праводзіліся раз у квартал, а раз у год - навукова-практычная канферэнцыя. Напрыклад, у студзені 1983 г. гэтая канферэнцыя мела наступную тэму: «Месца і роля мастацтва ў сучаснай ідэалагічнай барацьбе». [8, 39-40]

Яшчэ адной формай ідэалагічнага выхавання творчых работнікаў была праца лекторыяў на базе рэспубліканскага Дома работнікаў мастацтваў і

Дома кіно. Для чытання лекцый па грамадска-палітычных тэмах і праблемах мастацтва сюды запрашаліся вядучыя спецыялісты з Масквы, Ленінграда і іншых гарадоў. Аднак ужо ў 1983 г. кіраўніцтва Мінскага гарадскога камітэта КПБ адзначала, што ў большасці творчых калектываў заняткі ў сістэме партыйнай вучобы маюць дрэнную арганізацыю і нізкі ўзровень падрыхтоўкі. Самі ж творчыя работнікі «не праяўляюць цікаўнасці да заняткаў у сістэме марксісцка-ленінскай адукацыі, спасылаючыся на неабходнасць увядзення спецыяльных курсаў для творчай інтэлігенцыі. Сур'ёзнай праблемай для калектываў з'яўляецца недастаткова высокі ўзровень падрыхтоўкі прапагандысцкіх кадраў у партыйна-палітычных пытаннях». [8, 41-42]

У лютым 1983 г. Цэнтральным камітэтам КПСС быў прыняты дакумент, які стаў праграмным для дзеяння ўсіх творчых устаноў Беларусі амаль да 1991 г. Гэта была «Пастанова ЦК КПСС аб працы партыйнай арганізацыі Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы». У пастанове зазначалася, што гэты тэатр з'яўляецца адным з вядучых на Беларусі, а яго партыйная арганізацыя карыстаецца заслужаным аўтарытэтам. Аднак ЦК КПСС заўважыў некаторыя недахопы ў дзейнасці партарганізацыі гэтага тэатра. На думку ЦК, у рэпертуары тэатра пакуль што «мала новых твораў, якія таленавіта, з партыйных пазіцый адлюстроўваюць важныя праблемы развіцця савецкага грамадства, тыповыя рысы характара нашага сучасніка». [2, 393] Пастанова добра ілюструе тое месца, якое адводзілася прафесійнаму мастацтву ў той час. Уся дзейнасць тэатра павінна была быць скіравана на ідэалагічнае выхаванне гледача, у сваіх спектаклях паказваць высакародныя мэты палітыкі камуністычнай партыі, раскрываць лепшыя рысы савецкага чалавека. Менавіта з гэтага пункту гледжання важна было, каб творчыя работнікі, асабліва маладыя, пастаянна знаходзіліся ў стане павышэння ўзроўню ідэалагічнай зрэласці. ЦК КПСС абавязваў партыйную арганізацыю тэатра ўзмацняць свой уплыў ва ўсіх аспектах жыццядзейнасці калектыва, асабліва на творчы працэс і адбор рэпертуару. [2, 395] Пастанова ярка адлюстроўвае стаўленне партыйнага цэнтра да рашэння нацыянальнага пытання, таму што ў ёй няма ніводнага слова аб тым, што нацыянальны тэатр, які працуе на беларускай мове, павінен садзейнічаць развіццю беларускага мастацтва.

Праграмная ўстаноўка, якая была закладзена ў гэтай пастанове, разгладалася ЦК КПБ, які распрацаваў план мерапрыемстваў па рэалізацыі гэтай пастановы. Тыя прапановы, якія выказваліся ЦК КПСС адносна тэатра імя Я. Купалы, аўтаматычна пераносіліся на ўсе прафесійныя творчыя калектывы рэспублікі. Бюро ЦК КПБ загадвала абмяркаваць пастанову ва ўсіх творчых калектывах. [5, 33] Было прынята рашэнне аб увядзенні партыйных і камсамольскіх работнікаў ў склад мастацкіх саветаў творчых калектываў. А іншыя змены ў складзе саветаў маглі адбывацца толькі па сагласаванні з абкамамі КПБ. Узмацнялася патрабаванне аб шэфскай працы з вытворчымі калектывамі і пашырэнні сеткі ўстаноў «ідэалагічнай адукацыі». Гэтая пастанова ЦК КПБ уводзіла з 1984 г. правядзенне рэспубліканскага агляду прац моладзі творчых калектываў. [5, 35] Такая ўвага да творчых калектываў з боку партыйных

органаў гаворыць аб значнасці ролі прафесійнага мастацтва ў ідэалагічнай працы сяр. 80-х гг.

Партыйны надзор вёўся і за правядзеннем выстаў твораў выяўленчага мастацтва. У 1986 г. у Мінску праводзіліся мерапрыемствы ў рамках Усесаюзнага тыдня выяўленчага мастацтва. У Траецкім прадмесці была падрыхтавана аднадзённая выстава твораў маладых беларускіх мастакоў. Арганізатары выставы без дазволу партыйных органаў вырашылі дапоўніць гэтую падзею тэатральна-музычным дзействам. У Траецкае прадмесце былі запрошаны самадзейныя рок-групы і фальклорныя калектывы. Група навучэнцаў Рэспубліканскай школы-інтэрната па музыцы і выяўленчаму мастацтву імя І. Ахрэмчыка падрыхтавала пастаноўку старажытнага абрада "Гуканне вясны". Падчас правядзення гэтага свята ўзнік канфлікт паміж яго ўдзельнікамі і студэнтамі, якія павінны былі падтрымліваць парадак па даручэнню Мінскіх абкама і гаркама ЛКСМБ. Членамі бюро ЦК КПБ гэты інцындэнт трактаваўся наступным чынам: "Атрыбутыка і знешні выгляд удзельнікаў, прымітыўна-архаічны змест абрада "Гуканне вясны" выклікалі абурэнне ў студэнтаў, і яны спрабавалі ўздзейнічаць на тое, што адбывалася, недазволенымі метадамі. Работнікі органаў унутраных спраў, якія прысутнічалі пры гэтым, не прынялі мераў па прадухіленню канфлікта. Нязначны па сваёй сутнасці інцындэнт стаў скажона тлумачыцца некаторымі прадстаўнікамі інтэлігенцыі і навучэнцаў, якія выдаюць сябе за "заступнікаў" нацыянальнай культуры. Некаторыя з іх імкнуцца навязаць памылковае тлумачэнне таго, што адбылося, падаць гэтае як праяву быццам бы арганізаванага супрацьдзеяння развіццю беларускай культуры, ігнаравання яе нацыянальнай самабытнасці". [6, 5]

Гэтая падзея разглядалася на паседжанні бюро ЦК КПБ 9 ліпеня 1986 г., на якім арганізатары выставы былі названы "палітычна няспелымі людзьмі". Выказвалася крытыка дзейнасці Міністэрства культуры, Мінскага гаркама КПБ і партыйных арганізацый некаторых творчых устаноў, якія неналежным чынам кантралявалі падрыхтоўку выставы. Было прынята рашэнне аб наказанні вінаватых. У сярэдзіне 80-х гг. уціск партыйнага апарату на развіццё нацыянальнай культуры быў вельмі моцны. Аднак, ужо сам факт правядзення гэтай выставы і звязаныя з ёй падзеі сведчаць аб фарміраванні цікаўнасці да беларускай культуры і адраджэнскіх працэсах у грамадстве БССР.

У канцы 80-х гг. партыйны ўплыў у творчых арганізацыях значна знізіўся. Аб гэтым заўважае партыйнае кіраўніцтва рэспублікі. У жніўні 1988 г. бюро ЦК КПБ абмяркоўвала пытанне працы Магілёўскага абкама КПБ з творчымі кадрамі. Быў адзанчаны невысокі мастацкі ўзровень пастановак у тэатрах вобласці, а таксама зніжэнне ролі пярвічных партарганізацый у падборы і ацэнцы рэпертуару. [7, 3] Партыйнае кіраўніцтва лічыла, што задачы мастацкай творчасці і пабудовы камунізма з'яўляюцца неразрыўнымі. "Клапоцячыся аб актуалізацыі зместу савецкага шматнацыянальнага мастацтва, далейшым удасканаленні яго сувязяў з жыццём, практыкай камуністычнага будаўніцтва, ЦК КПСС акцэнтуе ўвагу творчых работнікаў на найбольш важных, прынцыповых момантах гэтай працы. І перад усім на вывучэнні

рэальнасцей нашага быцця, якое павінна насіць усебаковы і сістэмны характар". [13, 71] Гэта азначала, што мастацтва і труд павінны шчыльней узаемадзейнічаць, што выражалася ў практыцы "культурнага шэфства". Літаратурна-мастацкія часопісы, напрыклад, праводзілі розныя мерапрыемствы (чытацкія канферэнцыі, літаратурныя вечары, творчыя справаздачы) на падшэфных заводах, у калхозах. Мастакі, кампазітары, дзеячы кіно і тэатра павінны былі таксама павышаць "культурны ўзровень" на месцах. Пры гэтым яны бліжэй вывучаюць рэаліі сацыялістычнага жыцця і адлюстроўваюць іх у сваіх творах. У сваю чаргу камуністычная партыя ўспрымалася як сіла, якая надае мастацкай інтэлігенцыі "моцныя імпульсы творчай і сацыяльнай актыўнасці", а рашэнні партыйнага кіраўніцтва "садзейнічаюць пошуку найбольш цікавых і эфектыўных формаў далучэння майстроў культуры да народнага жыцця". [13, 71]

Паміж творчымі калектывамі і прамысловымі прадпрыемствамі заключаліся доўгатэрміновыя дагаворы аб садружнасці. Напрыклад, тэатр оперы і балета супрацоўнічаў з Мінскім аўтамабільным заводам, тэатр імя Я. Купалы - з Мінскім трактарным заводам. Існавалі і іншыя формы садружнасці. У Мінскай вобласці на базе лепшых дамоў культуры і вясковых клубаў ствараліся эксперыментальныя тэатральна-канцэртныя цэнтры, дзе праходзілі спектаклі і канцэрты. У Віцебску быў створаны ўніверсітэт тэатральнага мастацтва пры драмтэатры з філіялам на аршанскім заводзе "Чырвоны Кастрычнік". Гродзенскі драмтэатр паказваў на прадпрыемствах "мэтавыя спектаклі", якія абмяркоўваліся аўдыторыяй.

Мерай па павышэнню "творчай актыўнасці і ідэйнай зрэласці" творчых работнікаў стала практыка запрашэння ў творчыя калектывы прадстаўнікоў партыйнага кіраўніцтва, гаспадарчых работнікаў, знакамітых працаўнікоў сяла. На думку партыйнага кіраўніцтва, доўг творчых работнікаў - "абагачаць духоўнае жыццё грамадства, садзейнічаць ідэйнаму і нраўственнаму росту чалавека працы, ствараць таленавітыя, праўдзівыя творы, якія адлюстроўваюць рэчаіснасць ва ўсёй яе шматграннасці і велічы, рашуча супрацьстаяць ідейна-культурнай агрэсіі імперыялізма, які імкнецца навязаць нашаму народу, перад усім моладзі, памылковыя вартасці, чуждыя гуманізму " гаварылася на Пленуме ЦК КПСС у студзені 1987 г. [13, 72-75]

У канцы 80-х гг. пачалі з'яўляцца новыя аспекты культурнай палітыкі, якія ў першую чаргу былі звязаны з кадрамі. У студзені 1988 г. калегіяй Міністэрства культуры СССР была прынята пастанова аб працы з творчай моладзю ў музычных установах. Міністэрства культуры БССР праанапізавала стан працы ў гэтым накірунку. Сутнасць гэтага дакумента падкрэслівае вытворчая тэрміналогія, якая тычыцца моладзі «у цэхах салістаў оперы, балета, хора і аркестра». [1,4] Выказвалася думка аб неабходнасці кардынальнага амалажэння трупаў тэатраў і творчых калектываў, стварэння эксперыментальных студый, актывізацыі працы грамадскіх арганізацый і творчых саюзаў з таленавітай моладдзю. [9, 59]

Факты сведчаць аб тым, што ўздзеянне партыйных органаў на развіццё прафесійнага беларускага мастацтва і дзейнасць творчых калектываў былі вельмі моцнымі ў сярэдзіне 80-х гг. На рубяжы 80-90-х гг. сітуацыя

рэзка змянілася. Гады перабудовы паўплывалі на агульнасаюзную дзяржаўную канцэпцыю культурнай палітыкі. Нямецкі саветолаг Дзірк Крэчмар так ацэньвае гэтыя падзеі: "Афіцыйная культурная палітыка 1984-1985 гадоў зрабіла сваім галоўным "тэатрам ваенных дзеянняў" адпор "заходнім уплывам", які б сэнс не ўкладаваўся ў гэтае слова-злучэнне. Культура, пабудаваная па законах сацыялістычнага рэалізма (ідэалізацыя замест асэнсавання ачагоў канфліктаў і памылковых шляхоў развіцця), а таксама, перш за ўсё, ваенна-патрыятычная літаратура павінны былі быць паднятыя да ўзроўню адзінай санкцыянаванай нормы. Гэтымі пастулатамі культурная палітыка Савецкага Саюза ў 1984-1985 гады больш чым калі ізалявала сябе ад культурнай рэальнасці... Міхаіл Гарбачоў канчаткова разарваў, нарэшце, з ідэалагічнымі канонамі савецкай сістэмы і вызваліў культуру з задушлівых ціскоў партыі". [3, 209-210] Замацавалася стаўленне да папярэдняй культурнай палітыкі як да "сістэмы ідэалагічнага дыктату ў галіне культуры і мастацтва", а будучае бачылася ў станаўленні грамадска-дзяржаўнага падыходу да арганізацыі культурнага жыцця.

У такім варыянце дзяржава бачылася гарантам забеспячэння дэмакратычнасці доступа грамадзян да культурных каштоўнасцей. Было відаць, што нават у новых эканамічных (рынкавых у перспектыве) умовах, матэрыяльны аспект дзяржаўнай падтрымкі не губляе сваёй актуальнасці, а толькі мяняе свае формы. Менавіта тады з'явілася думка аб неабходнасці мэтанакіраванага размеркавання сродкаў на культуру і мастацтва, а гэта значыць, што неабходна было распрацаваць новыя прыярытэтныя накірункі дзейнасці дзяржавы ў гэтай галіне. Хаця ў большасці тагачасных публікацый сфера культуры па ранейшаму называлася "падраздзяленнем народнай гаспадаркі", намеціліся новыя падыходы да кіравання ёю.

У сітуацыі ўсеагульнага развала прывычных умоў жыцця, крызіса ў эканоміцы, было зразумела, што нельга вырашыць глабальныя праблемы развіцця культуры. Невялікія сродкі, якія магла атрымаць галіна, трэба было эканомна расходаваць на канкрэтныя праграмы (гэты метад планавання называлі праграмна-мэтавым). Урадам ССР быў створаны фонд развіцця культуры і мастацтва Міністэрства культуры СССР, які павінен быў акумуліраваць сродкі з дзяржаўных бюджэтаў розных узроўняў, дабраахвотныя ўзносы і сродкі спонсараў. Сфера дзейнасці фонда - галоўным чынам падтрымка культурных сувязей і абменаў паміж саюзнымі рэспублікамі.

Адным з дзейсных метадаў уздзеяння на развіццё культуры і мастацтва была практыка заключэння дагавораў на стварэнне твораў у розных відах мастацтва па дзяржаўным заказе. У жніўні 1986 г. Міністэрствам культуры СССР было прынята «Палажэнне аб парадку арганізацыі ў сістэме Міністэрства культуры СССР працы па стварэнню новых твораў для драматычных, музычна-драматычных і дзіцячых тэатраў краіны». Папярэдняе палажэнне, якое рэгулявала гэтую сферу дзейнасці існавала з 1964 г. У дадзеным палажэнні дзяржзаказ, названы «дзейсным фактарам развіцця савецкай шматнацыянальнай культуры, павышэння ідэйнай і сацыяльнай эфектыўнасці мастацтва». [12, 43]

Палажэнне рэгламентавала таксама і пераклад драматургічных твораў на мовы народаў СССР. Падобная сістэма існавала і ў стварэнні твораў манументальнага і выяўленчага мастацтва. Адпаведнае палажэнне было прынята Міністэрствам культуры БССР у маі 1985 г. Дзяржзаказ лічыўся формай арганізацыі мастацкага працэса, якая накіроўвала творчых людзей на адлюстраванне «сацыяльна-эканамічных і культурных пераўтварэнняў у грамадстве развітога сацыялізма». У дакументах таго часу падкрэслівалася, што дзяржава сваім заказам на твор мастацтва «садзейнічае гарманічнаму развіццю ўсіх відаў і жанраў сацыялістычнага рэалізма». [11,1] Такім чынам, дзяржава падтрымлівала ў сяр. 80-х гг. толькі развіццё сацыялістычнага рэалізма як накірунка ў мастацтве. Калі ўлічыць той факт, што афіцыйна абнародаваць які-небудзь твор ў абыход міністэрства культуры альбо Саюза мастакоў было немагчыма, то зразумела, што творы іншых мастацкіх накірункаў проста не мелі магчымасці выстаўляцца і набывацца. Часцей за ўсё, створаныя па дзяржаўным заказе творы выяўленчага мастацтва набываліся з выстаў Дзяржаўнай мастацка-экспертнай камісіяй па творах выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Міністэрства культуры БССР. У выніку, твор, які набываўся, праходзіў шматузроўневую сістэму цэнзавання, праверкі і ацэнкі.

Нягледзячы на тое, што дзяржаўнае і партыйнае кіраўніцтва ў другой палове 80-х гг. па-ранейшаму трымалася састарэлых падыходаў у дачыненні да сферы культуры, працэсы агульнай дэмакратызацыі грамадства не маглі не паўплываць на яе змест. Асноўная канфрантацыя творчых работнікаў і дзяржаўных структур адлюстравалася ў гэты час ў абвастрэнні так званага «моўнага пытання». Творчая і нацыянальная інтэлігенцыя рэспублікі ў другой палове 80-х гг. актыўна абмяркоўвае праблему становішча беларускай мовы і шляхі павышэння яе статусу. 15 снежня 1986 г. на імя Генеральнага сакратара ЦК КПСС М. Гарбачова быў дасланы адкрыты ліст, падпісаны 28 пісьменнікамі, паэтамі, гісторыкамі і іншымі прадстаўнікамі інтэлігенцыі. У гэтым дакуменце звярталася ўвага на цяжкае становішча беларускай мовы, якое названа «культурным Чарнобылем». Сцвярджалася, што ў далейшым гэта можа прывесці да «духоўнага затухання» беларускай нацыі. [14, 24] Аднак гэты ліст не сустрэў належнага водгуку ў вышэйшых партыйных структурах. У сакавіку 1987 г. адбыўся чарговы пленум ЦК КПБ, на якім першы сакратар Я. Сакалоў растлумачыў некаторае звужэнне сфер ужывання беларускай мовы вынікам волявыяўлення працоўных. Кропку гледжання некаторых прадстаўнікоў беларускай інтэлігенцыі на гэтае пытанне ён палічыў памылковай. Гэтае выказванне спавадавала з'яўленне новага ліста, адрэсаванага М. Гарбачову, падпісанага 134 выкладчыкамі ВУЗаў і школ, творчых працоўнікаў і іншых. Нацыянальная палітыка савецкіх улад у дачыненні да Беларусі ў гэтым лісце трактуецца як русіфікацыя. [4, 402]

Актыўнае абмеркаванне моўнага пытання садзейнічала павышэнню цікаўнасці да беларускай мовы, павышэнню яе ролі ў працэсе нацыянальна-культурнага развіцця. Паступовa думка аб неабходнасці адраджэння ўкаранілася і на ўзроўні вышэйшага кіраўніцтва рэспублікі.

У першую чаргу гэта стала магчыма дзякуючы аслабленню ролі саюзнага цэнтра ў правядзенні ўнутранай палітыкі. Сепаратысцкія памкненні нацыянальных рэспублік выражаліся ў тым ліку і ў спробе правядзення новай нацыянальнай палітыкі, якая павінна была падкрэсліць адметнасці культуры і мовы народа. Аб змене арыентацый у моўным пытанні гаворыць пастанова калегіі Міністэрства культуры БССР «Аб павышэнні ролі беларускай мовы ў развіцці нацыянальнай культуры», прынятая 28 чэрвеня 1989 г.

Змест гэтага дакумента сведчыць аб тым, што ўжо ў к. 80-х гг. пытанне больш шырокага ўжывання беларускай мовы стала адным з пунктаў дзяржаўнай палітыкі ў галіне прафесійнага мастацтва, народнай творчасці і культпрасветработы. Міністэрства культуры БССР імкнулася ўкараняць беларускую мову ў мастацтве шляхам ажыццяўлення дзяржзаказаў на стварэнне нацыянальных твораў для тэатраў і музычных калектываў, перакладання твораў сусветнай драматургіі на беларускую мову, фарміраванне нацыянальнага рэпертуару ў самадзейных творчых калектывах. Пастанова прадугледжвала перавод на беларускую мову ўсіх устаноў, прадпрыемстваў і органаў культуры. [10, 1-9]

У 1990 г. быў прыняты закон Рэспублікі Беларусь «Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь». Дзяржаўнай мовай стала беларуская, планавалася перавесці на гэтую мову ўсё справаводства, адукацыю, навуку і г.д. 20 верасня 1990 г. Саветам міністраў БССР была прынята «Дзяржаўная праграма развіцця беларускай мовы і іншых нацыянальных моў Беларускай ССР». На беларускую мову планавалі перавесці службовае справаводства органаў упраўлення, павялічылася колькасць беларускамоўных школ і класаў.

У др. пал. 80-х гг. краіна перажывала складаны перыяд пераацэнкі каштоўнасцей савецкага ладу жыцця, які паказаў сваю няжыццяздольнасць. Кіраўніцтва СССР і КПСС прызнала неабходнасць рэфармавання эканомікі дзяржавы, пашырэння дэмакратыі і ўкаранення галоснасці. Гэта вылілася ў ажыццяўленне новага палітычнага курса, названага перабудовай. У гэты час сфера прафесійнага мастацтва афіцыйна ўспрымалася як адна з галін вытворчасці. У дзейнасць творчых калектываў актыўна ўмешваліся партыйныя органы розных узроўняў, нават можна заўважыць некаторы рост актыўнасці дзейнасці партыйных структур у дачыненні да прафесійнага мастацтва. Праграмным дакументам для тагачаснай палітыкі ў галіне прафесійнага мастацтва стала «Пастанова ЦК КПСС аб працы партыйнай арганізацыі Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы» (люты 1983 г.) Гэты дакумент прадугледжваў павышэнне ролі партыйных структур у дзейнасці творчых калектываў. Творчыя работнікі ў сяр. 80-х гг. знаходзіліся ў стане пастаяннай партыйнай ідэалагічнай апрацоўкі і надзора. Менавіта ў гэты перыяд вельмі актыўна выкарыстоўвалася такая форма ўздзеяння на культурныя працэсы як дзяржаўны заказ на стварэнне мастацкіх твораў для тэатра і эстрады. Праяўленне цікаўнасці да нацыянальнай гісторыі і культуры ўспрыймалася і трактавалася негатыўна. Аднак у гэты час сфарміраваліся перадумовы, якія сталі падмуркам далейшаму адраджэнню беларускай культуры. У канцы

гэтага перыяда беларуская мова афіцыйна атрымала статус дзяржаўнай, а БССР стала незалежнай краінай і атрымала назву Рэспубліка Беларусь. Камуністычная партыя Беларусі была ліквідавана, а прафесійнае мастацтва было вызвалена ад яе ідэалагічнага ўціску і цэнзуры.

КРЫНІЦЫ І ЛІТАРАТУРА:


1. Архіў Міністэрства культуры РБ, ф. 974, воп. 1, спр. 1900.
2. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898 - 1986) Т. 14, 1981 - 1984, - М., 1987.
3. Кречмар Д. Политика и культура при Брежневе, Андропове и Черненко. 1970 - 1985 гг., - М., 1997.
4. Лыч Л., Навіцкі У. Гістопрыя культуры Беларусі. Мн., 1996.
5. Нацыянальны архіў РБ (далей НАРБ), ф. 4, воп. 150, спр. 47.
6. НАРБ, ф. 4, воп. 160, спр. 462.
7. НАРБ, ф. 4, воп. 160, спр. 821.
8. НАРБ, ф. 4., воп. 160, спр. 963.
9. О состоянии работы с творческой молодёжью в музыкальных учреждениях и творческих союзах страны. Постановление коллегии Министерства культуры СССР, секретариата правления Союза композиторов СССР, центрального правления Всесоюзного музыкального общества от 11 января 1988 г., № 4.// Основные служебные документы за I квартал 1988 г. - М., 1988.
10. Пастанова калегіі Міністэрства культуры Беларускай ССР ад 28 чэрвеня 1989 г. № 35 «Аб павышэнні ролі беларускай мовы ў развіцці нацыянальнай культуры»// Нацыянальная бібліятэка, інв. № 7220, с. 1-9.
11. Положение о государственных заказах на создание произведений станкового изобразительного, декоративно-прикладного, народного искусства и порядке их осуществления Министерством культуры БССР (от 22 мая 1985 г.)// Бягучы архіў Міністэрства культуры РБ, с. 1.
12. Положение о порядке организации в системе Министерства культуры СССР работы по созданию новых произведений для драматических, музыкально-драматических и детских театров страны (от 22 августа 1986 г.)// Основные служебные документы за III квартал 1986 г. (Министерства культуры СССР). М., 1986.
13. Пригодич З. Постигая живую жизнь// Коммунист Болеруссии. 1987, № 7, с. 70-75.
14. Fedor H. Belarus and Moldova: Country studies. Federal Research Division, Librery of Congress, 1995.


*Акинчиц Т.И. (БрГУ, Брест)*

## ОБЫЧАЙ И ЕГО ЯЗЫЧЕСКО-ХРИСТИАНСКАЯ СИНКРЕТИЗАЦИЯ НА ПОЛЕСЬЕ.

Обычай представляет собой унаследованный стереотипный способ поведения, который воспроизводится в определенном этносе или социальной группе и является привычным для их членов. Посредством